# ШАЛОМ

АРТУР КЛІНАЎ



ВАЕННЫ
РАМАН

18+

Артур Клінаў

# Шалом

ваенны раман

*Выданне ў новай рэдакцыі*

Логвінаў

Гэта кніга, якая прымусіць вас па-іншаму зірнуць на наш свет. Прачытаўшы яе, вы нарэшце даведаецеся, ці ёсць сэнс жыцця, спасцігнеце таямніцу праклёну славянаў, навучыцеся зарабляць дваццаць тысяч еўра за месяц, зразумееце, як належыць паводзіцца ў выцвярэзніку і што трэба рабіць, калі да вас дахаты адно за адным прыходзяць пажарнік, участковы міліцыянт, цешча, поп і грамадзянін у шэрым паліто. Вы даведаецеся, як мыць валасы, не здымаючы шалома, і што трэба адказаць людзям, якія ўсё ж такі хочуць зняць яго з вашай галавы.

ISBN 978-609-492-040-0 (print)
ISBN 978-609-492-045-5 (online)

© Артур Клінаў, 2025
© Lohvinau Publishing House, 2025

# ЗМЕСТ


ЧЫЛІЙСКАЕ ЧЫРВОНАЕ 5

ЕГЕРМАЙСТАР 32

ФІНЛЯНДЫЯ 61

КРУПНІК 108

СКАРБ РАДЗІВІЛАЎ 141

БЕЛАЯ РУСЬ 160

КРЫЖАЧОК 182

ІДАЛ ВЯРНУЎСЯ 257

Не ўсе падзеі ў рамане
прыдуманыя,
але ўсе супадзенні
з рэальнымі асобамі
выпадковыя.

# ЧЫЛІЙСКАЕ ЧЫРВОНАЕ

Раніцай ён прачнуўся ад дзікага жадання піць. Зразумеўшы, што спіць у адзенні, сяк-так узняўся, адпіў палову бутэлькі мінеральнай вады, распрануўся і плюхнуўся зноў у ложак. Так бы ён і спаў да самага вечара, і, магчыма, нічога гэтага б не здарылася, калі б не трыклятыя цешчыны боты.

Ён успомніў пра іх гадзіны праз дзве, калі прачнуўся адпіць наступныя паўбутэлькі вады. Розум пранізала балючая думка, што сёння субота — апошні дзень у Боне, і ўжо заўтра трэба выпраўляцца назад у Магілёў. Але да гэтага ён мусіць зрабіць шопінг — купіць падарункі дочкам і жонцы, а галоўнае — боты для цешчы, якая адмыслова выдала на гэта грошы. Вядома, можна зрабіць шопінг у Берліне, але ён будзе там усяго пару дзён. Тут жа за месяц ён прыгледзеў усё неабходнае, трэба толькі адарваць хворую галаву ад падушкі і прайсціся па даўно вядомых месцах.

Ён зноў забраўся ў пасцель і тупа ўтаропіўся ў белы шар люстры, што звісала са столі. Думка пра шопінг не давала расслабіцца і заснуць. “Вось паскудства! — павярнуўся ён на бок. — Чакаеш адкрыцця выставы,

быццам адкрыцця дзвярэй у новае жыццё. А там усё: слава, грошы, пашана, прыгожыя машыны, дамок у Ніцы. А адкрыеш — і тое самае лайно: бадун, смага, Хведар Міхайлавіч, скаціна... нажэрся... Швэпсу б зараз... лімоннага... А шчэ гэтыя ідыёцкія цешчыны боты!"

***

Напярэдадні ён прысутнічаў на банкеце з нагоды заканчэння скульптурнага пленэру, на якім ён правёў гэты месяц. Незадоўга да гэтага яны з Генрыхам зганялі на "Лідл", дзе набылі па пары віна і дзве бутэлькі таннага віскі — чатыры семдзесят еўра за пляшку. За шмат гадоў вернісажнага стажу ён засвоіў адно бясспрэчнае правіла: на кожны, няхай нават самы шыкоўны, банкет трэба прыходзіць са сваім. Тады ты пачуваешся гаспадаром пляжу. Цябе не турбуе тузаніна каля столікаў з дармовым вінам, ты не падлічваеш з трывогай колькасць пакуль не адкаркаваных бутэлек, што хаваюцца за спінамі афіцыянтаў, і пагатоў ты ўпэўнены, што а дзясятай вечара табе не давядзецца бегчы да найбліжэйшай бензакалонкі па дарагое і гідкае пойла, таму што ўсе крамы ў наваколлі ўжо зачыненыя.

Перад пачаткам імпрэзы яны, уладкаваўшыся з выглядам двух яснавяльможных паноў на лавачцы за скульптурай Генрыха, перакулілі па пляшцы чылійскага. Генрых быў клёвым хлопцам, такім жа, як ён, простым шарагоўцам вялікай арміі мастацтва, чые безыменныя магілы калі-небудзь будуць рассеяны па бязмежных палёх лэнд-артаў, відэаартаў, оп-, поп- ды ўсялякіх іншых канцэптуал-артаў. Аднак яго

“скульптура”, больш падобная да дачнага драўлянага клазета, які невядома навошта паставілі на галоўнай алеі парку, яму не вельмі падабалася. Яму больш падабалася інсталяцыя Франкі — лабірынт з вялікіх поліэтыленавых плёнак. Калі ён заходзіў унутр, плёнкі пачыналі варушыцца ад ветру і вабілі прайсці далей — у глыбіню сваіх суплётаў, дзе, здавалася, гледача павінен чакаць нейкі прыемны эратычны сюрпрыз.

Яму падабалася гэтая праца, але яшчэ больш падабалася сама Франка. Калі яна ўпершыню зайшла ў майстэрню, яго ўразілі яе вочы — вялікія, прыгожыя і маркотныя. Ён адразу зразумеў, што Франка з тых вальтанутых салдатак мастацтва, якія аддаюць яму ўсё жыццё, маючы наўзамен адно адзіноту ды стосы каталогаў з калектыўных выставаў і нейкіх ідыёцкіх пленэраў. Ці то з сімпатыі, ці то са спагады, ён зараз жа прапанаваў госці на выбар: піва, віно альбо віскі. Яна пагадзілася на віскі, але, не дапіўшы і паўшклянкі, сышла, пакінуўшы ў майстэрні водар “Шанэлі” ды стрэмку на сэрцы.

Потым Франка часта заходзіла да яго, выпівала кілішак віскі, распавядала нешта пра свае праекты ды называла яго на французскі манер — Андрэ. Звычайна сябры звярталіся да яго па прозвішчы або проста казалі “Андрэй”, жонка часам называла “Андрэйка”, але “Андрэ” гучала неяк асабліва прыгожа. У гэтым не было ані будзённага “Андрэя”, ані крыху прасцецкага “Андрэйкі”, затое прысутнічала нешта такое, што ўзносіла яго на Манмартр, у рамантычныя мроі, неяк міжволі змяшчаючы яго імя поруч з Мадыльяні, Радэнам, Пікасо.

“Андрэ” любіў маркотныя вочы Франкі, бачыў у ёй музу. Адно яе імя ўвасабляла ў сабе нешта ўзнёслае. Франка… Францыя… Загадкавая краіна, што вабіла яго з самога юнацтва. Парыжскія кавярні, Эйфелева вежа, “Мулен Руж”, пляц Пігаль, Ван Гог, Дэга, Тулуз-Латрэк. “Андрэйка” ж меў больш сціплыя мэты. Ён хацеў проста по-франтавому зацягнуць Франку ў пасцель. Аднак тая штодня яшчэ завідна з'язджала ў горад, дзе начавала ў стрыжанай андрагіннага выгляду сяброўкі. Шанц спакусіць яе мог з'явіцца толькі на адкрыцці выставы, калі госці нікуды не будуць спяшацца, а, падагрэтыя дарамі фуршэту, пачнуць складаць цёплыя і вясёлыя кааліцыі з перспектывамі, што сыходзяць у ноч.

Адвесіўшы тузін кампліментаў “клазету”, які збудаваў Генрых, сербануўшы па вялікім глытку віскі проста з рыльца, яны адправіліся на адкрыццё выставы. Народу да таго часу з'ехалася нямала. Акрамя Андрэ і сямі немцаў, у пленэры ўдзельнічалі яшчэ пара французаў, італьянец, швейцарац і адзін фін.

Усе, апроч яго, былі мастакамі з “матухны” Еўропы і тусавалі з пленэру на пленэр, быццам гэта было нешта штодзённае, накшталт выправы ў булачную па свежы багет. Ён жа прадстаўляў маленькую, забытую Богам краіну, што прытулілася дзесьці за плотам Еўропы. Усім, хто знаходзіўся з гэтага боку, яна ўяўлялася страшным Мордарам з казак Толкіна, дзе ўладу захапілі оркі, якія здзекаваліся з бедных хобітаў ды ўсяляк уціскалі іх грамадзянскія правы.

Каб дапамагчы няшчасным хобітам, клапатлівая “матухна” час ад часу запрашала іх на які-небудзь семінар — растлумачыць, як перамагчы оркаў на выбарах

і ператварыць Мордар у дэмакратыю хобітаў. Часам на літаратурны фестываль — паслухаць, як гучыць іхняя дзіўная архаічная мова, альбо, як цяпер, — на скульптурны пленэр, каб пераканацца, што яны ўвогуле яшчэ існуюць і нават здольныя вырабляць творы мастацтва.

Што праўда, многія хобіты, не чакаючы нейкага адмысловага запрашэння, самі рознымі шляхамі прабіраліся цераз шчыліны плоту і распаўзаліся па ўсім неабсяжным матчыным падворку, ствараючы маленькія, у прынцыпе бясшкодныя і нікому не заўважныя калоніі ў Берліне, Бруселі, Амстэрдаме, Варшаве. У такую мікраскапічную берлінскую калонію хобітаў Андрэ, уласна, і збіраўся наведацца на пару дзён адразу пасля пленэру. Але спачатку ён мусіў закончыць адну важную справу — спакусіць Франку, якая, як яму здавалася, і сама была б не супраць.

Ён адразу знайшоў яе вачыма, калі яны з Генрыхам, ужо цалкам “вясёлыя”, уваліліся ў павільён, дзе стаялі накрытыя фуршэтныя сталы. Госці — у асноўным аматары мастацтва з Бона ды Кёльна — паходжвалі па залі з келіхамі чырвонага віна.

— Ну что, окропим глотку красненьким? — Андрэ ўхапіў келіх з падноса, што праплываў побач. — А ты ведаеш, а ў нас віно робяць з бульбы. Толькі яно зялёнага колеру і завецца “Крыжачок” — танец ёсць такі народны. Галоўная праблема, калі яго п’еш, — чым глотку заткнуць, каб назад не выйшла. Проста цукерка альбо кавалак хлеба не дапамогуць. Лепш за ўсё агурок салёны ці цыбуліна, тады ёсць шанец, што яно ў табе застанецца.

— Так… так… “Ка-за-цок”, — зачаравана паўтарыў Генрых.

Тым часам гутаркі наўкол сцішыліся, і на сцэну пачалі выходзіць усялякія важныя, адмыслова запрошаныя госці. Яны распавядалі аб тым, які выдатны выйшаў праект, як ён дапамагае наладжваць кантакты паміж народамі, ды ўсякія іншыя разумныя рэчы.

Андрэ пакінуў Генрыха слухаць прамовы пра дружбу народаў, а сам паволі рушыў у бок Франкі. Праціснуўшыся праз публіку, ён стаў у яе за спінай і пачаў поглядам лашчыць яе станістае цела. У думках запусціў рукі пад сукенку, абмацаў сцёгны, потым пасунуўся вышэй, наблізіўся да таліі, затым пайшоў ніжэй, яшчэ ніжэй. Быццам адчуўшы, Франка раптам абярнулася і шапнула на вушка:

— Прывітанне! Як ты?

— Ты ж сёння не з’едзеш? Калі ўсё скончыцца, хадзем да мяне!

— Пабачым, — напаўнамёкам на згоду адазвалася яна.

Шчаслівы, падбадзёраны Андрэ пакінуў Франку слухаць пахвалы высокаму майстэрству мастакоў, якія тут сабраліся, а сам паляцеў да Генрыха, каб на радасцях зрабіць з ім яшчэ па адным салідным глытку.

Усё пачыналася нядрэнна і, мабыць, мусіла таксама нядрэнна скончыцца, калі б пасля другога глытку віскі на сцэну не ўскараскаўся Андрэйка. Яго нахабная пыса з алейнымі юрлівымі вочкамі прамалявалася праз высакародны твар Андрэ, як толькі яны з Генрыхам адасобіліся ў хмызах і, глынуўшы з гарла, запалілі па цыгарэце.

Далей падзеі разгортваліся па звычайным для Андрэйкі сцэнары. Калі б нават ён піў, але засяродзіў увагу

на Францы, то, верагодна, усё пайшло б паводле плану. Але, пабачыўшы столькі незнаёмых маладзенькіх фройляйн, якія пасля сканчэння ўрачыстай часткі высыпалі з павільёна, яго агаладалыя вочкі наліліся алеем валяр'яны, і ён кінуўся знаёміцца, паіць і абходжваць кожную, за каго чапляліся ягоныя кіпцюры.

Хоць пленэр і называўся "скульптурным", але, хутчэй, гэта было тое, што цяпер завецца "інсталяцыяй", калі твор складаецца з разнастайнага хламу альбо рэчаў новых, але па магчымасці недарагіх — дошак, кардонак, бляшанак, цвікоў, сена, тканіны, травы. Большасць інсталяцый месцілася не ў павільёне, а была раскіданая па вялікай тэрыторыі старога парку, па якой тым часам пачалі разбрыдацца госці ды мастакі. Андрэйка таксама скіраваўся да месца, дзе прытулілася ягоная "скульптура", і падрыхтаваўся да сустрэчы маладых фройляйн, якія рана ці позна мусілі натыкнуцца на гэты шэдэўр. Пагатоў ён быў аб'ектам надзвычай прыкметным.

Андрэйка стварыў дзве вялікія скульптуры з саломы. Адна ўяўляла з сябе аголеную Венеру, другая была копіяй антычнага Апалона. Статуі стаялі на пастаментах адна супраць другой у бакавой алеі парку і выглядалі як два вялікія, вышэйшыя за чалавечы рост, калматыя мядзведзі. Пазнаць у адным з іх Венеру магчыма было па адсутнасці рук і вялікіх саламяных грудзях, што крыху нязграбна тапырыліся вожыкамі ў тры бакі свету. Апалон жа стаяў з узнятай рукой і чамусьці гэткім жа значным, як рука, калматым чэлесам, што пяўся кудысьці ў напрамку Венеры, быццам руля расійскага танка ў бок Прусіі.

Як толькі пачалі з'яўляцца госці, Андрэйка з розным градусам натхнення ўзяўся тлумачыць ім, што ён, уласна, жадаў сказаць гэтым творам. Калі падыходзіла сталая пара або які-небудзь крытык, яго аповед быў скупы і халодны. Ён нешта казаў пра новыя магчымасці, якія дае мастаку такі матэрыял, як салома, пра сувязі з традыцыяй, пра новае прачытанне класікі, удавана цяжка ўздыхаў і нешта няўцямна падтакваў, калі гутарка заходзіла аб нягодах хобітаў у яго няшчаснай краіне.

Аднак, калі падыходзіла маладзенькая зграбная фройляйн, ён тут жа ўскокваў на каня, выцягваў пластыкавы кубак, прапаноўваў паненцы віскі, сам рабіў ладны глыток з бутэлькі, а далей яго несла ў неўтаймаваныя стэпы натхнення. Ён распавядаў пра геніяльнасць саломы як матэрыялу і яе двухсэнсоўнасць. Пра тое, што пры святле яна ззяе чыстым золатам, але, калі прыгледзецца, кожны прадмет, выраблены з саломы, уяўляе з сябе ўзор спарахнення матэрыі, пацярруху, якой, па сутнасці, ёсць усё зямное. Асабліва гэта тычыцца саламяных чалавекаў, якія нагадваюць яму паўспарахнелых ваўкалакаў з фільмаў жахаў.

Далей ён пераходзіў да асаблівасцяў саламянага сэксу. Распавядаў пра ягоную абсалютную экалагічнасць і перспектыўнасць. Пра тое, як менавіта павінны займацца гэтым саламяны Апалон і саламяная Венера, і што трэба рабіць, каб партнёры не разваліліся падчас акту. Паненкі не без задавальнення і цікаўнасці выслухоўвалі яго, пасмейваючыся, выпівалі віскі і, нягледзячы на спробы Андрэйкі даўжэй затрымаць якую-небудзь фройляйн каля саламяных мішак, адвальвалі.

Тым часам сцямнела. Наведнікаў стала менш. Андрэйка раптам згадаў пра Франку і з жахам зазначыў, што віскі ў пляшцы амаль скончылася. Перш за ўсё, падумаў ён, неабходна знайсці Генрыха — у яго мусіць заставацца яшчэ бутэлька, а потым выправіцца на пошукі Франкі.

Ён прыспеў Генрыха ў адным з зацішных куткоў парку ў невялікім, але вясёлым таварыстве. Той быў ужо добра п'яны, і віскі ў яго бутэльцы заставалася не болей за шклянку. Упэўненым жэстам прыватызаваўшы апошняе, Андрэйка зрабіў вялікі глыток і ўсе наступныя падзеі гэтага вечару памятаў ужо фрагментарна.

Яны, змяняючы кампаніі, яшчэ пілі нешта з іншых бутэлек. Ён па-ранейшаму спрабаваў абаяць нейкіх фройляйн, але быў ужо ў такім градусе, што палёт яму не даваўся, а выглядала ўсё неяк непрыстойна і пошла. Пару разоў яны перасякаліся з Франкай, але тая знаходзілася ў кампаніі незнаёмага і агіднага плэйбоя. Потым яны ганялі з Генрыхам на бензакалонку купіць яшчэ бухла. Затым ён спяваў нейкім паненкам "Очи черные, очи страстные..." і "Тум-балалайку", размаўляў з кімсьці ў хмызах пра ролю будучай беларускай рэвалюцыі, выконваў раздзяўбаным басам "Смело мы в бой пойдем..." і запрашаў усіх у Магілёў. У іншых хмызах ён распавядаў пра Маскву як новую Меку сусветнага мастацтва, спяваў ужо зусім раздзяўбаным басам "Боже, царя храни", нахабна заляцаўся да Франкі ў прысутнасці незнаёмага плэйбоя і каля чатырох гадзін ночы незразумела якім чынам прыцеляпаўся да сябе ў пакой, адразу адключыўшыся на неразабраным ложку.

***

“Вось сволач, Марыя Пракопаўна! І тут сваімі абцасамі мяне дастала! Добра, — нарэшце вырашыў ён, — чорт з вамі, шопінг дык шопінг! А ў абед, пасля шпацыру, вып’ю ў горадзе пару куфляў піва”.

Думка пра піва падалася прыемнай. У адрозненне ад шматлікіх прыяцеляў, Андрэ стараўся не пахмяляцца. Ужо шмат гадоў ён вызнаваў метад Хведара Міхайлавіча. Ён сам вынайшаў гэты спосаб змагання з запоямі, назваўшы яго ў гонар улюбёнага пісьменніка свайго юнацтва — Хведара Міхайлавіча Дастаеўскага.

Сутнасць метаду была простай. Калі напярэдадні ты нажэрся, як свіння, то мусіш адбыць пакаранне: не піць наступнага дня да заходу сонца нічагуткі, акрамя вады. Ты павінен здабыць збавенне пакутамі ўласнага цела, прайсці праз выпрабаванне, павісець, прыбіты вялікімі ржавымі цвікамі да свайго пахмелля.

Андрэ ішоў да гэтага метаду доўга. У маладосці, па дурасці ды недасведчанасці, ён, як і большасць аднагодкаў, практыкаваў ранішняе лекаванне. Але, выпіўшы раніцай, ён працягваў рабіць гэта днём, потым увечары, а да ночы быў ужо ўшчэнт п’яны. Наступнай раніцай выпіваў ізноў — і паўтаралася тое ж самае. Гэтак магло працягвацца некалькі дзён запар, тыдзень і нават больш. Аднойчы ён зразумеў, што праблема хаваецца ў першай чарцы, дакладней, часе сутак, калі яе падымаеш. Калі ты прымаеш чарку ўвечары, так бы мовіць, пасля заходу сонца, то шанц заблукаць у запоі становіцца мінімальным.

Здзівіўшыся прастаце і геніяльнасці свайго адкрыцця, Андрэ падвёў пад яго тэарэтычную базу, абгрунтаваў спасылкамі на класікаў ды Святое Пісанне і стаў прапаведаваць гэтае вучэнне ўсім і паўсюль.

З цягам часу Андрэ і сам так паверыў у Хведара Міхайлавіча, у ягонае “праз пакуты да дасканаласці”, што нават пачаў знаходзіць у гэтым нейкае мазахісцкае задавальненне. Бывала, крэпка выпіўшы напярэдадні, ён у пакутах, абліваючыся халодным потам, ішоў да дасканаласці — чакаў захаду сонца. Але ў той самы час у гэтых пакутах прысутнічала нейкае салодкае прадчуванне, якое расло, павялічвалася, брыняла з кожнай хвілінай. Андрэ ўяўляў, як, калі праб’е шэсць, ён падыме гэты смачны куфель халоднага піва, і яно пральецца ў ягонае спустошанае і спакутаванае нутро самой дасканаласцю — чароўным, сонечным, жыватворным напоем.

Зазвычай час захаду сонца Андрэ прызначаў на шостую вечара. Але сёння, у сувязі з асаблівай цяжкасцю пахмелля і праз гэтыя чортавыя цешчыны боты, ён вырашыў прызначыць яго раней — а другой ці трэцяй гадзіне дня. З намаганнем устаўшы, прыняўшы халодны душ і з агідай з’еўшы нейкі ёгурт, ён выйшаў на вуліцу.

Верасень завяршаўся тым прыемным надвор’ем, калі дні яшчэ сонечныя, але не спякотныя, зеляніна дрэваў не паспела звяць, а неба цешыць вока сваім амаль палетняму глыбокім блакітам. Час набліжаўся да паўдня, але вуліцы Бона былі па-суботняму бязлюдныя.

Андрэ падабаўся гэты горад. Ён нагадваў яму вялікі ціхі санаторый, куды часам прыемна патрапіць, каб

паправіць змучаную “Крыжачкамі” і нягодамі жыцця па той бок “матчынага” плоту нервовую сістэму. Зрэшты, усе нямецкія гарады, акрамя Берліна, былі для яго падобныя да санаторыяў. Калі час ад часу Андрэ сюды прыязджаў, яму нават здавалася, што ён жаўнер, якога адпусцілі з фронту на пабыўку дадому — адпачыць і набрацца сілаў. Але праз некалькі дзён апошні вечаровы цягнік ізноў павязе яго на ўсход, у смуродныя брудныя акопы, туды, дзе вошы і блохі, туды, дзе страляюць, — на перадавую.

Аднак застацца тут назаўжды ён не хацеў. Андрэ з цяжкасцю ўяўляў сабе, як прабавіць рэшту дзён у санаторыі, у цішы гэтых вялікіх антыкварных куфраў. Як будзе бясконца шпацыраваць сярод гэтых прыемных разбяных домікаў, пакуль раптам не звар’яцее ад іх харавства. “Не, — падумаў ён, паскараючы крок, — набуду боты, вып’ю піўка — і назад у Магілёў. Нашыя куфры, хоць і не такія фігурныя, дый не куфры яны ўвогуле, а хутчэй — валізы з біркамі ды скрынкі з-пад ботаў, але мне ў іх добра ды ўтульна”.

Таго, што здарылася далей, магло не здарыцца, і жыццё Андрэ ніяк бы не змянілася. Ён вярнуўся б у смуродныя акопы, забытыя дзесьці пад Магілёвам, карміў бы там вошай, пакуль не дэмабілізаваўся б па выслузе гадоў альбо па стане ўжо ладна падарванага франтавымі напоямі здароўя.

А можа, яго б забіла шалёная куля, ён быў бы атручаны іпрытам, ці яго выпадкова пераехала б танкам альбо трактарам “Беларусь”, прыбіла асколачнай бутэлькай з-пад “Савецкага шампанскага”, ці кантузіла “зводкай Інфармбюро”. А можа, ён быў бы заколаты

відэльцам на банкеце ў карчме “Вернісаж” альбо раздзерты адэптамі, расчараванымі ў слушнасці жыцця паводле Хведара Міхайлавіча, ці яшчэ горш — незадаволеныя мерцвякі падняліся б з магілёўскіх магілаў ды пацягнулі яго за сабой, каб пакараць за халтуру, якую ён паставіў на могілках.

Аднак лёс накіраваў Андрэ ў вялікую краму, дзе чакалі цешчыны боты, не кароткім шляхам, а ў абыход, праз пляц, дзе ў гэты час, як звычайна па суботах, праходзіў флюмаркт — блышыны рынак, на які гандляры з наваколляў Бона звозілі ўсялякі старадаўні пацешны хлам. Ён, вядома ж, абраў гэту дарогу, бо любіў пакорпацца ў старых рэчах. Грошай, каб купіць, у яго не было, але Андрэ падабалася хаця б проста паразглядаць іх ды на ўсякі выпадак пацікавіцца коштам — а раптам патрапіцца нешта добрае ды недарагое.

Да моманту з’яўлення Андрэ плошча ўжо віравала людзьмі, што круціліся вакол прылаўкаў са старымі бронзавымі гадзіннікамі, парцалянавымі статуэткамі, кніжнымі фаліянтамі, фігурнымі жырандолямі ды іншай дыхтоўнай старызнай. Што праўда, бонскім блышыным рынкам Андрэ быў не надта задаволены. Яму больш падабаліся таннейшыя і дэмакратычныя берлінскія, дзе, апроч дарагой дробнабуржуазнай лухты, можна было набыць зацяганыя порначасопісы па еўра за штуку, стары капеечны відэаплэер, плюшавага мядзведзіка, картуз французскага паліцыянта, талерку са свастыкай, штоф з зялёнага шкла і яшчэ шмат таго, што больш грэла сэрца. Аднак, апынуўшыся на плошчы, Андрэ сцішыў крок ды пачаў у паўвока прыглядацца да тавару.

Гэты прадмет ён заўважыў не адразу. Дакладней, заўважыў, але спачатку не надаў значэння і зрабіў некалькі крокаў наперад. Потым раптам спыніўся. Павярнуўся. І паглядзеў поўным вокам.

Перад ім на пакладзеным проста на зямлю абрусе, сярод усялякага хламу, якога ён ужо не заўважаў, стаяў Шалом — начышчаны да бляску, зіхоткі, у залатых промнях сонца, кайзерскі шалом прускага жаўнера — пікельхаўбэ з накіраванай у неба востраканечнай пікай. У галаве Андрэ нешта хруснула. Вусны перасохлі. У грудзёх шалёна загрукала, як быццам нейкі нягоднік-баксёр залез у яго і моцна біў знутры дзвюма вялікімі скуранымі пальчаткамі.

Скамянеўшы між прылаўкамі, Андрэ зачаравана глядзеў на Шалом. Невядома, колькі часу ён мог бы так прастаяць, калі б хтосьці нечакана не штурхануў яго.

— Пшэпрашам, а-а... прабачце, бітэ... — усе мовы раптам зблыталіся ў яго галаве.

Зрабіўшы два рашучыя крокі насустрач, ён узняў на Шалом палец і запытаў:

— Колькі каштуе?

— Пяцьсот еўра, — гандляр, грубы, сівы мужык гадоў пяцідзесяці без усялякага энтузіязму ацэньвальна паглядзеў на Андрэ.

— Данке! — той павярнуўся і расчаравана патупаў далей.

Аднак, прайшоўшы метраў трыццаць, раптам спыніўся. У ягонай галаве пачынаўся дзіўны незразумелы бунт. Думкі збегліся з розных бакоў і спрабавалі адначасова з хрыпатой перакрычаць адна другую.

“Не! Нават не думай! Цешча цябе прыб’е! Гэта яе грошы. Чортаў лузер, цешчы спалохаўся? Плюнь на цешчу! Яна і так цябе ненавідзіць! Плюнуць? А майстэрню не шкада? Як прарэктар, мігам выселіць. Яна нават Барыса Фадзеіча за жабры трымае! Не, гарбатага магіла… як быў няўдачнікам, так няўдачнікам застанешся, калі зараз жа яго не купіш! Гэта твой шанц! Зрабі ўчынак, змяні ўсё! Шанц? А ты ўяўляеш, што будзе, калі ты прыедзеш у ім у Магілёў? З тваіх дзяцей будуць смяяцца і называць іх бацьку раганосцам! Пляваць! І так усе ведаюць, што ты раганосец! Думаеш, толькі табе вядома, што ў Светкі раман з Эдуардам? А сам? Святоша на адно вока! Лепей маўчы! Ды Светка выставіць цябе за дзверы і запусціць наўздагон самай цяжкой чыгуннай патэльняй! Ха-ха! Калі яна пацэліць у галаву, на ёй жа будзе Шалом! Дарэчы, ты заўтра едзеш на фронт, і ведаеш — у акопе без Шалома нельга! Ідыёт. Дажартуешся калі-небудзь! Ты адпалохаеш усіх кліентаў! Тваіх страшыдлаў і так ніхто не бярэ. А цяпер хто даверыць помнік прыдурку ў прускім Шаломе? Ды ліха іх бяры, гэтых кліентаў! Хіба ты аб гэтым марыў, калі хацеў стаць скульптарам? Ты хацеў быць як Радэн, ствараць вечнае! А зараз ты хто? Чмо, што ваяе халтуры для могілак! Аднойчы пакрыўджаныя мерцвякі сапраўды цябе адмудохаюць дзе-небудзь на зацішнай алеі! Ды цябе ж будзе спыняць кожны мент і пытацца пашпарт! Нічога! Ты зробіш новы пашпарт і сфатаграфуешся на яго ў Шаломе! Цябе пакажуць па абласным канале, дзе назавуць масонам і лідарам мясцовай апазіцыі! Не страшна! Ты станеш папулярным! Ханыгі ў магілёўскіх піўнухах будуць частаваць півам! Хведар Міхайлавіч будзе вельмі

рады! Уяві, як ён узвесяліцца на нябёсах, пабачыўшы цябе ў прускім шаломе! Ды ты што! Твае адэпты вырашаць, што ты чокнуўся, і пачнуць піць да захаду сонца! Няхай бухаюць! Не прапусці свой шанц! У цябе атрымаецца! Ты станеш больш знакаміты за Чалавека-сабаку! Гэтыя тупыя куратары пачнуць запрашаць цябе на сур'ёзныя выставы! Уяві! Слава! Бабкі! Домік у Францыі! Падумай! Што ты страчваеш! Лайно, з якога ніколі не вылезеш! Але ў цябе нават няма пяцісот еўра, каб яго набыць! А грошы на цешчыны боты? Грошы на падарункі дочкам, жонцы, на квіткі дадому? А яшчэ зэканомленыя на танным пойле з "Лідлу" сутачныя! А як жа ты паедзеш дадому?! Фігня! Дабярэшся да Берліна аўтастопам! А там хобіты дапамогуць! Прыдурак, адчыні дзверы ў новае жыццё! Дзеці на вуліцах будуць тыцкаць у цябе пальцам! Чортаў няўдачнік, гэта твой шанц! Нават не думай! Ты павінен яго купіць! Не! Але ж ты хочаш яго купіць?!"

— МАЎ-ЧАЦЬ!!!!!

Андрэ раптам заўважыў, што ўсе людзі, якія стаялі наўкол, неяк дзіўна паглядзелі на яго. "Ну досыць, гэта ўжо занадта!" — сказаў ён сам сабе і рашучай хадою накіраваўся ў краму, дзе чакалі цешчыны боты. Імкліва ўвайшоўшы ў яе, ён падняўся на другі паверх і шырокім чаканным крокам, як жаўнер, размахваючы рукамі, наблізіўся да прылаўку. Убачыўшы чорную пару на высокіх шпільках, спыніўся, пагардліва, з агідай паглядзеў на яе, падумаў імгненне, павярнуўся і гэтак жа імкліва рушыў назад.

— Колькі каштуе? — спытаў ён зноўку, нечакана паўстаўшы перад сівым гандляром.

— Пяцьсот еўра.
— Чатырыста!
— Чатырыста дзевяноста!
— Чатырыста дваццаць!
— Чатырыста восемдзесят пяць!
— Чатырыста пяцьдзясят!
— Чатырыста восемдзесят пяць!
— Чатырыста шэсцьдзясят!
— Чатырыста восемдзесят!
— А! Чорт з табой! Чатырыста семдзесят!

Андрэ пачаў выцягваць з кішэняў прыхаваныя на розныя мэты заначкі. Адлічыўшы чатырыста семдзесят еўра, ён перадаў іх сівому, узяў у рукі Шалом і з трыумфам пераможцы над абцасамі ўзняў яго на галаву!

Сэрца Андрэ вырасла да памераў вялікай птушкі і ашалела забілася. Ён быццам скінуў кайданы, якія даўно скоўвалі яго. У галаве ўсё гудзела, білася, грукатала. Прадчуванне чагосьці новага, нязведанага напаўняла лёгкія радасным паветрам свабоды. Андрэ з выклікам акінуў позіркам людзей, якія з цікаўнасцю паглядалі на яго.

“Цудоўна! Захад сонца прызначаны на тры. Самы час прыкончыць пахмелле!” — сказаў ён сабе і рашуча накіраваўся да бара на другім канцы плошчы.

***

— Гэй! Біг-Бен! Ты з якога палка?

Павярнуўшыся, Андрэ ўбачыў за суседнім столікам падпітага калматага мужыка з нахабнай фізіяноміяй, які зыркаў на яго вытарашчанымі брунатнымі вачыма.

— Якой трасцы ты напяў на сябе гэту каску? Вайна закончылася, — не чакаючы адказу, працягнуў калматы.

— Заўтра раніцай я выпраўляюся на ўсход, туды, дзе вайна не скончыцца ніколі.

Мужык сербануў з куфля і зноў паглядзеў на Андрэ.

— Не забудзься прыхапіць валёнкі. Тамака ў Сібіры, кажуць, суворыя зімы.

За акном браліся прыцемкі. Ён сядзеў у піўной ужо дзве гадзіны. Паветра ў бары, здавалася, было густым ад хмелю, цыгарэтнага дыму і гоману мноства галасоў, якія пчаліным роем кружылі над залатымі бутонамі піўных куфляў. Мабыць, цяпер Андрэ сапраўды быў падобны да лонданскага Біг-Бена, што самотна ўзвышаўся ў тумане пракуранай піўнухі, працінаючы неба вострым пазалочаным шпілем. Працягваць размову з калматым мужыком не хацелася. Разлічыўшыся ля барнай стойкі, ён падхапіў заплечнік і выйшаў у прахалодныя вераснёўскія прыцемкі.

Вярнуўшыся ў свой пакой, Андрэ зараз жа накіраваўся ў ванную, каб нарэшце добра разгледзець сябе ў люстры. Ён не быў прыгажуном, таму кожная перамога давалася яму з вялікім высілкам. Даводзілася браць розумам, абаяннем, часам — рэвалюцыйнымі спевамі і красамоўствам. Было ў яго твары нешта вераб'інае: маленькія, невыразныя зелянява-балотнага колеру вочы, крыху кірпаты нязначны нос, запалыя шчокі без прыкмет жыццесцвярджальнага румянца. Калі б ён меў мужны падбародак, то ўся канструкцыя магла б набыць завяршэнне. Але падбароддзе таксама было вераб'інае, крыху ўпалае, з прыкметамі выраджэння. Фігура Андрэ была падобная на грыб, з якога знялі

шапку і пакінулі сіратліва тырчаць з зямлі нязграбную крывую ножку. Сам ён лічыў сябе калі не выродцам, то ўжо напэўна чалавекам, да якога Творца паставіўся абыякава, не надта папацеўшы падчас стварэння.

Аднак цяпер ягоны твар быццам знайшоў завяршэнне. Шалом сядзеў на ім проста ідэальна, як быццам быў створаны дакладна для яго галавы. Проста ад макаўкі адыходзіў вертыкальны залаты шпіль. Чымсьці ён нагадваў шпільку цешчынага бота, толькі яна не прыбівала да зямлі, а летуценна ўзносіла ў неба. Андрэ змераў шпіль двума пальцамі, прыкінуўшы, што вышынёй ён каля дванаццаці сантыметраў.

Шалом быў напаліраваны да ідэальнага бляску. Сівы гандляр, мусіць, добра пашчыраваў перад сённяшнім кірмашом. Прысунуўшыся бліжэй да люстэрка, Андрэ паспрабаваў разгледзець рэльефны малюнак кукарды. На шыкоўным франтоне Шалома важна гарцавалі два залатыя львы. Яны ці то трымалі ў лапах, ці то спрабавалі вырваць адзін у аднаго залаты рыцарскі шчыт. Львы, відавочна, займаліся геапалітыкай, тузаючы распластаную на шчыце рыбу. Каб лепей разгледзець Шалом, Андрэ міжволі пацягнуў рукі ўгару, як раптам строгі ўнутраны голас прымусіў яго замерці.

“Стой!!! Не ўздумай здымаць! Калі ты яго здымеш, уся канцэпцыя знікне! Ты не павінен яго здымаць, нават калі цябе ніхто не бачыць! У гэтым сэнс! Сэнс? Гэта ідыятызм! Ідыятызм? А дзе грань паміж ідыятызмам і сэнсам? Калі нехта абвесціць свету: “Я — Сабака!” Распранецца і стане голы бегаць па вуліцах, брахаць на мінакоў, кусаць іх за ногі. Усе скажуць: “Ідыёт!” Але калі гэты нехта мастак, то ўчынак яго ўжо маніфест!

А ідыёты тыя, хто ў ім сэнсу не бачыць! Ты праслужыў простым шараговым жаўнерам вялікай арміі мастацтва ўсё жыццё. Ты згубіў лепшыя гады ў акопах, паходах, пад абстрэламі, у гразі, лайне, віне, пошуку сэнсу і прыгажосці. І што ўзамен? Дзе слава? Дзе пашана? Дзе медалі і медныя трубы? Што прынесла тваё служэнне? Бабак у цябе няма. Сям'і нармалёвай — таксама. Жонка і цешча ціха ненавідзяць. Твае геніяльныя праекты завісаюць у пустэчы. Таму што нарадзіўся ты ў няправільным месцы, за плотам, у дупе. А самотны голас з дупы пярдзёж завецца. І ўсялякія дробнабуржуазныя фізіі, можа, і чуюць яго, але з прыстойнасці выгляду падаваць не жадаюць. Ты лузер! Самы банальны лузер! Але цяпер у цябе з'явіўся шанц! Калі ты Шалом зараз здымеш, то дакладна зробішся ідыётам! Ты мастак! Падымі бунт! Паўстанне! Абвясці свету свой маніфест! Зрабі з Шалома праект! Чалавек-Шалом! Да такога яшчэ ніхто не дадумаўся!"

Андрэ па-ранейшаму стаяў ля люстра, трымаючы рукі на Шаломе. Сумневы не давалі прыняць канчатковае рашэнне. На імгненне яму нават падалося, што два львы ў яго на лбе — зусім не львы, а дзве львіныя змяі-спакусніцы.

— Не ўздумай здымаць! — раптам ледзь чутна прашыпела адна.

— Ідзі лепш адкаркуй бутэльку віна, што ў цябе за шафай! — падміргнула другая.

Адарваўшыся ад люстэрка, Андрэ выцягнуў прыхаваную за шафай бутэльку і напоўніў шклянку.

"Быць лузерам, калі табе дваццаць, не страшна. Аднак у сорак шанцаў узяць шлюб з удачай практычна

ніякіх. Што ты губляеш? Паглядзі, як весяляцца львіцы на тваёй галаве! Цяпер ты не верабей, а леў! Апошні леў невядомай вайны! Ну, здымеш ты яго, вернешся да сябе ў Магілёў. Ну, запросяць цябе яшчэ на пару пленэраў. І алес капут? А што далей? Зрабі ўчынак! Адчыні дзверы ў новае жыццё! Іншага шанцу ў цябе не будзе!"

— Новае жыццё! Лузер… Лузер… — ён размерана, якківач вялікага гадзінніка, ад сцяны да сцяны хадзіў па пакоі. — Гэта твой шанц! Канцэптуальны праект!.. Не верабей... Леў… Сабака... У сабакі атрымалася. Тыцкайце пальцам… Ганаруся гэтым... Самотны голас з дупы... Новае жыццё... Шанц... Чалавек у Шаломе... Адчыні дзверы... Чорт падзяры! А як жа галаву мыць?! Не важна! Пасля прыдумаецца нешта...

— Новае жыццё! Новае жыццё! Лузер… Лузер… Лузер… — Андрэ ўсхвалявана хадзіў па пакоі, ціха мармычучы абрыўкі нейкіх фразаў. — Чалавек у Шаломе! Чалавек у Шаломе! Шанц! Гэта твой шанц! Канцэптуальны праект! Я ідыёт… Тыцкайце пальцам… Ганаруся, ганаруся гэтым… Непахмялёныя лычы… Самотны голас з анусу… Канцэптуальны мастак… Новае жыццё… Новае жыццё… Шанц… Чалавек у Шаломе… Адчыні дзверы…

— Добра! Заканчваем дыскусіі! — нарэшце гучна вымавіў ён. — Заўтра рана ўставаць!

Узняўшы шклянку, Андрэ залпам асушыў яе і адправіўся спаць.

***

Уначы яму спалося кепска. Шалом быў яшчэ нязвыклы, да таго ж аказаўся дастаткова мулкім. Хоць стома

і валіла з ног, ён часта прачынаўся і скрозь сон лавіў урыўкі трывогі, што подла праслізгвалі ў галаву. Андрэ круціўся з боку на бок, спрабуючы знайсці больш зручную позу, але Шалом усё адно кудысьці ўпіраўся і нешта яму сціскаў.

Потым ён апынуўся на Васільеўскім востраве, на “п’яным рагу” непадалёк ад другой лініі. Працягнуў чырвонец чарняваму пацану.

— Дзве сухога, калі будзе — чырвонага, — сказаў ён і стаў чакаць.

Побач у цемры круцілася нейкая ніякая дробная старая і кленчыла грошы. Андрэ даў ёй пяцьдзясят капеек. Пад’ехала таксоўка. З яе выйшлі дзве дзеўкі — з выгляду блядзі. Зарадзілі дзве гарэлкі.

— Зара зраблю, — адказаў ганец і знік у чорнай зяпе падваротні. Неўзабаве вярнуўся, аддаў дзеўкам дзве пляшкі. Тыя скокнулі ў таксоўку і ўкацілі.

Хвілін праз пяць з’явіўся ягоны дзяцюк, адвёў Андрэ ўбок.

— На, трымай, — ён азірнуўся па баках і дастаў з-за пазухі валёнак.

— Чаму адзін?

— Скончыліся валёнкі, — сказаў пацан, вяртаючы пяць рублёў. — Пойдзеш па гэтым адрасе, скажаш: ад Севы, — ён працягнуў складзены шматок паперы. — Тамака павінен быць другі. Гэта побач. Зара выйдзеш на Сярэдні, збочыш налева, дойдзеш да Чацвёртай, там направа і другая падваротня — зноў налева.

Андрэ адразу знайшоў патрэбную падваротню. Спыніўся пад бляклым ліхтаром прачытаць нумар кватэры. У падваротні было цёмна, сыра і смярдзела катамі.

Ён адшукаў пад'езд і пачаў узбірацца па стромкіх і вузкіх чарнавых сходах. Калі дайшоў да трэцяга паверху, спыніўся: "Мусіць, тут". Пакорпаўшыся ў кішэнях, адшукаў запальнічку. Слабы агеньчык асвятліў маленькі кавалачак старых шчарбатых дзвярэй. Андрэ павёў рукой уверх і натыкнуўся на нумар: "Дваццаць пяць, так, гэта тут!" Пазваніў.

Адчынілі не адразу. Праз нейкі час за дзвярыма пачуўся шоргат. Хтосьці з таго боку зняў дзвярны ланцужок. Пстрыкнуў замок. Пры слабым агеньчыку запальнічкі Андрэ імгненна пазнаў таго самага калматага нахабнавокага мужыка з кнайпы. Праўда, на ім цяпер красаваўся чорны хасідскі капялюш, з-пад якога звісалі даўгія з сівізною пэйсы. Мабыць, мужык таксама пазнаў яго. Ва ўсялякім разе ён адразу сказаў: "Шалом!" — і павёў па доўгім і цёмным калідоры, асветленым толькі адной бляклай лямпачкай, уздоўж мноства зачыненых дзвярэй. Спыніўшыся ля адных з іх, ён жэстам запрасіў увайсці.

— Мне патрэбны яшчэ адзін валёнак, — сказаў Андрэ, працягваючы мужыку скамечаную пяцёрку.

— Пачакай тут, — вымавіў калматы і знік за цяжкой парцьерай, дзе хаваўся бакавы пакойчык.

Андрэ агледзеўся па баках. Пакой быў даволі вялікі і двума высокімі вокнамі выходзіў на вуліцу. Са столі звісала масіўная масянжовая жырандоля. Прастору ўздоўж сцен займалі старыя пацямнелыя шафы. Шафаў мелася так шмат, што стаялі яны адна на другой і нават у цэнтры залі, таму ў цэлым пакой здаваўся цесным. Дакладна пасярэдзіне, пад жырандоляй, месціўся вялікі круглы стол, побач стаяў

металічны ложак з панцырнай сеткай. На ложку сядзела старая, тая, якой Андрэ даў пяцьдзясят капеек, і ела кефір, чэрпаючы яго лыжкай проста з літровага слоіку. Яна ела павольна і размерана, не звяртаючы на Андрэ ніякай увагі, як быццам яго тут зусім не было. Ён міжволі прыняўся зачаравана сачыць за рухамі старой. У іх дакладным рытме таілася нейкая гіпнатычная сіла, нібы гэта быў ківач вялікага гадзінніка, што ціха адлічваў час: цік-так, цік-так, цік-так...

— Тварам да сцяны!!! Рукі на патыліцу!!! — нягучна, але рэзка і нечакана прагучала раптам ззаду.

Андрэ адчуў, як нешта цвёрдае ды невялікае тыцнула яго ў спіну. Ён павольна падняў рукі і павярнуўся. Нябачная далонь моцна пхнула яго наперад так, што ён упёрся галавой у вялікую шафу. Яе драўляная, фарбаваная карычневым шурпатая паверхня была цяпер зусім блізка. Ён бачыў невялікія шчылінкі і прагалы аблупленай фарбы. Андрэ адчуў прыемнае казытанне лямцу на сваёй шыі. Гэта быў той самы валёнак, які ён купіў у пацана і ўвесь гэты час трымаў у руках.

— Здымай Шалом! — раптам вымавіў за спінай нябачны нехта.

“Трэба ўцякаць!” — мільганула ў галаве, і Андрэ з сілай, наколькі дазваляла ягонае становішча, кінуў валёнкам у бок невядомага. Сам жа ён паспрабаваў рэзка павярнуцца і рвануць да дзвярэй, але — халера! — галава ягоная засела ў шафе! Яна ўваткнулася ў яе пікай Шалома і захрасла, нібы прыбітая велізарным цвіком! Андрэ пачаў вырывацца, ухапіўся за Шалом абедзвюма рукамі і стаў моцна цягнуць на сябе, але той нібы

намёртва прыліп да шафы! Ён з жахам зразумеў, што нават не можа павярнуцца, каб убачыць, хто знаходзіўся ў яго за спінай! Тым часам невядомы пачаў лупцаваць яго валёнкам, а затым раптам учапіўся ў шыю і з усяе сілы пацягнуў на сябе…

— Ааааа!!! Халера! Цьху-цьху-цьху! Трэба ж прысніць такое! — ускрыкнуў Андрэ, расплюшчыўшы вочы і знайшоўшы сябе ў пакоі на ложку.

Ён паспрабаваў павярнуцца на іншы бок, але зразумеў, што не можа, бо Шалом уваткнуўся ў нейкую шчыліну і засеў там. Выдраўшы яго, Андрэ пасунуў падушку бліжэй да сярэдзіны, каб Шалом ужо ні ў што не мог упірацца. Аднак цяпер ногі ўпіраліся ў процілеглую спінку. Тады ён устаў і, скінуўшы матрац на падлогу, улёгся побач з ложкам.

Рэшту ночы Андрэ правёў ужо не на Васільеўскім востраве. Яму яшчэ штосьці снілася, але што менавіта, ён ужо не мог прыгадаць.

***

Раніца першага дня новага жыцця выдалася цёплай і сонечнай. Андрэ прачнуўся крыху разбіты, але ў цэлым настрой быў добры. Яму прыгадаліся Піцер і Васільеўскі востраў, дзе ён падоўгу жыў у майстэрні прыяцеля, у сутарэннях на З'ездаўскай лініі. Відаць, не выпадкова менавіта сёння ён прысніўся яму.

Васільеўскі ўставаў рана, і ўжо на золку Андрэ скрозь сон чуў яго варушэнне. За невялікімі паўкруглымі акенцамі склепа пачыналі грукатаць трамваі, якія заўсёды прачыналіся раней за іншых.

Потым праз адчыненую фортку да яго далятаў грукат абцасаў мінакоў, якія, спяшаючыся на ранішнюю змену, адкідвалі цені сваіх ног на цюлевыя фіранкі майстэрні. Затым прастора за вокнамі напаўнялася шоргатам шынаў, крыкам клаксонаў, віскатам тармазоў, галасамі, смяшкамі, кашлем, мацюгамі. Андрэ падымаўся і, крыху ўскудлачаны, выходзіў на вуліцу, каб зрабіць першы глыбокі глыток новага дня. Ззяла сонца, неба было высокім і бясконца блакітным. Вуліца ўпіралася ў Тучкаў мост, які паўколам уздымаўся над ракой і, здавалася, сыходзіў у неба, у цудоўнае чыстае неба яго будучага жыцця, якое выпраставала над ім свае загадкавыя крылы.

Радаснае прадчуванне разлілося па ўсім целе Андрэ. “Аднак пара!” — вымавіў ён і накіраваўся ў ванную. Сумневы больш не мучылі яго. Узяўшы душ, не здымаючы Шалома, ён насуха выцер яго і зноў паглядзеўся ў люстэрка.

Ільвы на кукардзе былі абсалютна аднолькавыя, быццам кожны ўяўляў сіметрычную копію другога. У Андрэ нават праслізнула думка, што леў насамрэч адзін, а ў лапах ён трымае не шчыт, а люстэрка, у якім бачыць свой адбітак. Праўда, рыба па цэнтры ламала сіметрыю. Яе трэба было размясціць вертыкальна, што было б сімвалічна: нібыта яна саслізгвае са шчыта, як сэнс, і праз залаты шпіль узносіцца ў пустэчу.

Зірнуўшы на сябе яшчэ раз, Андрэ падумаў, што ўсё ж такі гэта Шалом не шараговага жаўнера, а генерала. Інакш навошта ў акопе такая цацка, што блішчыць за сто кіламетраў, так і просячыся ў бінокль якому-небудзь прыдурку з процілеглага акопу?

Ён уявіў на імгненне, як нейкі незнаёмы прыдурак, накшталт таго, што душыў яго ўначы, доўга назірае за ім у перыскоп, а затым гучна загадвае:

— Батарэя! Гаўбіцу зараджай! Плі!!!

І вось ужо здаравенны снарад памерам з вядро набліжаецца ў цемры да ягонай галавы з таго боку люстэрка.

“Не! — перапыніў яго палёт Андрэ. — Гэткі Шалом неабходны для парадаў, каб вітаць армію на белым кані!”

Спехам нешта з’еўшы, ён пералічыў рэшту грошай — пятнаццаць еўра ды дробязь. Узяўшы заплечнік, Андрэ прыкінуў, што можна пакінуць тут, каб не абцяжарваць падарожжа непатрэбным грузам. У першую чаргу ён адклаў убок грувасткія каталогі, што надарылі яму жаўнеры мастацтва падчас пленэру. З лёгкім сумам пагартаўшы, кінуў туды ж і альбом Франкі.

— Пасля іх хоць каталогі застануцца, пасля нас жа і гэтага не будзе, — па-філасофску прамовіў Андрэ і рашуча выкінуў усё, што палічыў малапатрэбным у новым жыцці. Прысеўшы на дарожку, ён счакаў імгненне і, выдыхнуўшы: “З Богам!” — выйшаў на вуліцу.

# ЕГЕРМАЙСТАР

Бон выпраўляў Андрэ ў падарожжа да новага жыцця цудоўнай сонечнай раніцай. Вуліцы ў ціхі нядзельны дзень былі пустынныя, таму ніхто не заўважыў, як дзіўны чалавек у залатым прускім Шаломе бадзёра крочыў у напрамку прадмесцяў.

— Бывай, Бон! Бывай, бацька Рэйн! — пасылаў Андрэ прывітанне гэтаму ласкаваму дню.

Ісці было лёгка і радасна. Весялосць перапаўняла яго, змешвалася з прахалодным паветрам восені і прасякала лёгкія адчуваннем, забытым з юнацтва. Тым, калі таямніца жыцця бегла перад табою, знікала за паваротам, далягядам, вабіла ў нязведанае падарожжа. З такім пачуццём Андрэ выйшаў на гарадскую ўскраіну. Тут ужо можна было кагосьці лавіць, але машыны, не спыняючыся, праляталі міма. Мінула больш за гадзіну. Надвор'е паціху пачало псавацца. Зграйка дробных хмарак схавала сонца. Здавалася, яшчэ крыху — і яны кінуць на зямлю жменьку капрызных восеньскіх кропель. Нарэшце поруч з Андрэ прытармазіў белы "Пежо". Бакавое шкло апусцілася, і з салону зірнулі два цікаўныя вокі.